Спакойна, велічна і плаўна,
Ці ноч, ці ранняя зара,
Нясе рака даніну спраўна
Каля падножжа Мазыра.
Тут шмат гадоў назад гучалі
Званы з царкоўнае сцяны.
І адгукаліся ім далі
Ў час трывог, у час вайны.
Глядзіш як кожны сіні ранак
Імчаць "ракеты", чаўнакі,
І чуеш гоман мазыранак,
Ідучых дружна да ракі.
Наш горад быццам выйшаў з казкі.
Глядзіць спакойна ў далячынь.
І на пагорках вельмі частых
Расце ў завоблачную сінь.

З часоў узнікнення горад жыве сваім адухоўленым жыццём, ён стварае сваю тысячагадовую гісторыю, ён важная састаўная частка гэтай гісторыі. І гэтую гісторыю разам з горадам пішуць людзі…

Пішацца і мастацкая гісторыя, і летапіс слаўнага народа. Мазыр здаўна меў гістарычнае і эстэтыснае значэнне, вось чаму ён трапляў у поле зроку аматараў прыгожага слова з даўніх часоў, з глыбокай старажытнасці. І ва ўсе часы, ва ўсе эпохі знаходзіліся людзі, шчодра адораныя, якія, захапляючыся ягонай прыгажосцю і незвычайнасцю, усхвалялі родны горад і велічную раку Прыпяць, царыцу Палесся, у паданнях, легендах, вершах, паэмах. Менавіта тут адбывалася станаўленне таленту Сяргея Палуяна, Івана Навуменкі. Уславўлялі і ўслаўляюць у сваіх творах Мазыр і Прыпяць пісьменнікі-землякі – Святлана Басуматрава, Іван Капыловіч, Анатоль Бароўскі, Галіна Дашкевіч, Андрэй Феларэнка, Уладзімір Верамейчым.

У Сярэдзіне XIX ст. сярод літаратараў становічча папулярным эсэістыка і такая яе форма, як "падарожжа". Адным з такіх пісьменнікаў-падарожнікаў быў Павел Шпілеўскі, вядомы найперш як аўтар краязнаўчага нарыса "Падарожжа па Палессі і Беларускім краі", у якім даволі падрабязна ў геаграфічных, гістарычных, культурных і эканамічных адносінах былі разгледжаны гарады і мястэчкі, размешчаныя ўздоўж паштовага тракту Брэст – Мінск. Своеасаблівым працягам гэтага твора стала праца "Мазыршчына". У ёй аўтар засяродзіў сваю ўвагу на маршруце ад Мазыра да Давыд-Гарадка, ахопліваючы такім чынам найбольш значныя населеныя пункты тагачаснага Мазырскага павета.

У гісторыю прыгожага пісьменства ўвайшла як таленавіты празаік і драматург Эма Яленская, якая нарадзілася ў вёсцы Камаровічы Мазырскага павета. Шмат намаганняў удзяляла асветніцкай дзейнасці, арганізоўвала школы, супрацоўнічала з перыёдыкай.

Шмат таленавітых людзей звязалі сваю долю з Мазыром і краем: Эдуард Пякарскі – славуты падарожнік, вучоны; Сяргей Палуян – таленавіты деларускі літаратар і крытык.

Няўлоўны ход гісторыі, дух народа, непаўторныя рысы адметнага нацыянальнага характару захоўваюцца ў своеасаблівай паэтычнай форме – песні. Адным з вядомых паэтаў, праслаўляюцых Мазыр, Прыпяць і Палесся быў Уладзімір Верамейчык.

Гісторыя літаратурнага руху пачалася ў Мазыры яшчэ напрыканцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя, калі вакол мясцовай раённай газеты згуртавалася кола таленавітых аўтараў. Анатоль Малюк, Уладзімір Отчык, Віктар Пархімовіч, Уладзімір Рудзінскі, – гэтыя, як маладыя, так ўжо і з

жыццёвым досведам паэты сталі заснавальнікамі Мазырскага літаратурнага аб’яднання “Прыпяцкія хвалі” і актыўнымі аўтарамі літаратурнай старонкі ў сваёй “раёнцы”. З часам да іх далучыліся Анатоль Бароўскі, Васіль Рагаўцоў, Алесь Лісіцкі, а пазней Генадзь Манкевіч, Васіль Андрыеўскі, Галіна Дашкевіч, Таццяна Дарошка і інш. Кніга з аднаіменнай назвай “Прыпяцкія хвалі” ўбачыла свет у 2002 годзе дзякуючы руплівай працы мясцовага паэта Васіля Андрыеўскага, які адшукаў і сістэматызаваў вершы аўтараў, што у розныя час прадстаўлялі літаратурны рух Мазыра.

Шмат аўтараў, якія праслаўляюць свой родны край, мазыршчыну, ў сваіх творах – як у вершах, так і ў прозе, сабраў пад сваім дахам мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт, які носіць імя народнага пісьменніка і выдатнага дзеяча Івана Пятровіча Шамякіна. Выкладчыкі, студэнты, выпускнікі універсітэта: Васіль Андрыеўскі, Ніна Аксенчык, Анатоль Бароўскі, Аляксандр Воўкаў, Аляксандр Герцык, Галіна Дашкевіч, Анатоль Дзеркачоў, Любоў Жураўская, Ганна Іванова, Кацярына Іванова, Наталля Ісаева, Мікола Клімовіч, Ігар Карабанаў, Анатоль Малюк, Людміла Піскун, Яўгенія Піскун, Алег Рэвуцкі, Васіль Шапялевіч, Соф’я Шах, не з’яўляюцца прафесіянальнымі паэтамі, але кожны з іх – творчы чалавек, улюбёны ў свій край, у звонкае беларускае слова. Мастацкія творы, прысвечаныя роднай Беларусі, яе мінуламу, сённяшняму і заўтрашняму дню, вызначаюць актыўную жыццёвую пазіцыю аўтараў, якія трывожацца за лёс сваёй радзімы, яе будучыню, за адраджэнне гісторыі, культуры, нацыянальных беларускіх традыцый. Лейтматывам у мастацкіх творах праходзіць і тэма вайны, Чарнобыля, узаемаадносін чалавека і прыроды, кахання, сэнсу жыцця на зямлі.

Палеская зямля заўсёды служыла і служыць для паэтаў невычэрпнай крыніцай натхнення, дае ім жыццевую і творчую сілу.

Іван Паўлавіч Мележ … Нарадзіўся ў сялянскай сям'і: бацька — Павел Фёдаравіч, маці — Марыя Дзянісаўна. Скончыў сямігодку ў Алексічах, дзесяцігодку (СШ № 1) у Хойніках (1938), працаваў у Хойніцкім райкаме камсамола. У 1939 паступіў у Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры і з 1-га курса быў прызваны ў Чырвоную Армію. Летам 1940 удзельнічаў у далучэнні Паўночнай Букавіны да СССР. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце — на Збручы, пад Уманню, Нікалаевам, Сінелькавам, Растовам-на-Доне, Лазавой. У чэрвені 1942 пад Растовам цяжка паранены і пасля лячэння ў тбіліскім шпіталі адпраўлены ў тыл. Жыў у Бугуруслане, потым выкладаў ваенную падрыхтоўку ў Малдаўскім педагагічным інстытуце, а з 1943 — у БДУ, які знаходзіўся тады на станцыі Сходня ў Падмаскоўі, дзе вучыўся спачатку завочна на філалагічным факультэце, а затым перайшоў на стацыянар (скончыў у 1945 ужо ў Мінску). Пасля вучыўся ў аспірантуры, выкладаў беларускую літаратуру ва ўніверсітэце, працаваў у рэдакцыі часопіса «Полымя», у апараце ЦК КПБ. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1945, з 1966 — сакратар, а ў 1971—1974 — намеснік старшыні праўлення СП БССР.

Дэбютаваў у 1939 вершамі. Першае выступленне ў друку як празаіка адносіцца да 1943 (газета «Бугурусланская правда»). Першае апавяданне на беларускай мове «Сустрэча ў шпіталі» (1944). Адно з ранніх апавяданняў — «У завіруху» — высока ацаніў Кузьма Чорны. У 1946 яно дало назву зборніку. Аповесць «Гарачы жнівень» (1946) пра цяжкасці аднаўленчага перыяду. Выдаў зборнікі аповесцей і апавяданняў «Гарачы жнівень» (1948), «Заўсёды наперадзе» (нарыс, 1948), «Блізкае і далёкае» (1954), «У гарах дажджы» (1957), «Што ён за чалавек» (апавяданні, аповесці, нарысы, 1961).

Першы раман «Мінскі напрамак» (1952). У 1960—70-я г. гэты твор перапрацаваны і стаў больш шматпланавым і маштабным па ахопе падзей, багатым на сапраўдныя народныя характары, праз якія паказана героіка і трагедыя вайны.

Іван Мележ — аўтар цыкла раманаў «Палеская хроніка»: «Людзі на балоце» (1962), «Подых навальніцы» (1966) і «Завеі, снежань» (1978). Раман «Людзі на балоце» ён пачаў як твор лірычны і называў яго «лірычным раманам», а наступныя раманы трылогіі ствараў ужо як трагедыйныя раманы-даследаванні. У іх выявілася грамадзянская смеласць і ідэйна-мастацкая маштабнасць у асэнсаванні складаных абставін калектывізацыі на Палессі, жыцця Беларусі 1920—30-х г., праўдзівасць і шчырасць аўтара ў спалучэнні з яго высокай прафесійнай культурай, глыбокім і тонкім псіхалагізмам, разуменнем душы беларускага селяніна. Непаўторная мастацкая канцэпцыя тагачаснага жыцця народа, вялікі ідэйны змест данесены праз дасканалую мастацкую форму і адметныя вобразы. «Палеская хроніка» — глыбокае філасофска-мастацкае асэнсаванне жыцця беларускага народа на вельмі важным гістарычным этапе, яна стала нацыянальнай эпапеяй.

Напісаў п'есы «Пакуль вы маладыя» (1956, асобнае выданне ў 1958, пастаўлена ў 1957), «Дні нашага нараджэння» (апублікавана і пастаўлена ў 1958), аднаактоўку «Хто прыйшоў уночы» (1959, асобнае выданне ў 1966). Па раманах «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» Беларускім тэлебачаннем створаны ў 1966 г. спектакль. Беларускім тэатрам імя Янкі Купалы пастаўлены ў 1966 г. спекталь «Людзі на балоце», Гомельскім абласным тэатрам — «Подых навальніцы» (1977), у 1989 г. — «Страсці эпохі» (паводле рамана «Завеі, снежань»), Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1962) за раман «Людзі на балоце», Ленінскай прэміі (1972) за раманы «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы», Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за кнігу крытычных нарысаў, артыкулаў «Жыццёвыя клопаты» (пасмяротна).

У 1975 Іван Мележ выдаў кнігу літаратурна-крытычных артыкулаў, эсэ, інтэрв'ю і публіцыстыкі «Жыццёвыя клопаты» (Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Коласа 1976), у 1977 выйшла «Першая кніга» (дзённікі, запісы ваенных гадоў).

Іван Пятровіч Шамякін , нарадзіўся 30.01.1921 г. у вёсцы Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.Скончыў Гомельскі тэхнікум будаўнічых матэрыялаў (1940). У 1940-1945 гг. у Савецкай Арміі - камандзір гарматы, затым камсорг дывізіёна. Удзельнічаў у баях пад Мурманскам, у вызваленні Польшчы, у баях на Одэры. У 1945-1948 гг. настаўнічаў у вёсцы Пракопаўка Церахаўскага раёна. З 1946 г. вучыўся на завочным аддзяленні Гомельскага педагагічнага інстытута. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1950). Працаваў старшым рэдактарам Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, галоўным рэдактарам альманаха «Советская Отчизна». З 1954 г. - намеснік старшыні, з 1966 г. - сакратар, з 1968 г. - другі сакратар, з 1971 г. - першы намеснік старшыні, у 1976-1980 гг. - першы сакратар праўлення СП БССР. З 1980 г. - галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя». У 1963 г. як сябра дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XVIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1963-1985) і СССР (1980-1989). Старшыня Вярхоўнага Савета БССР (1971-1985). Член-карэспандэнт АН БССР. Сябра СП СССР з 1947 г.

Герой Сацыялістычнай Працы (1981). Узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі.

Народны пісьменнік БССР (1972).

У час Вялікай Айчыннай вайны выступаў у армейскай газеце «Часовой Севера» з нарысамі і вершамі. У 1945 г. надрукаваў аповесць «Помета» (часопіс «Полымя»). Аўтар раманаў «Глыбокая плынь» (1949, інсцэніраваны ў 1956), «У добры час» (1953), «Крыніцы» (1957, інсцэніраваны ў 1961), «Сэрца на далоні» (1964, інсцэніраваны ў 1965), «Снежныя зімы» (1970), «Атланты і карыятыды» (1974, аднайменны відэафільм Беларускага тэлебачання, 1980), «Вазьму твой боль» (1979, экранізаваны ў 1981), «Петраград - Брэст» (1983), «Зеніт» (1987). Цыкл з пяці аповесцей («Непаўторная вясна», 1957; «Начныя зарніцы», 1958; «Агонь і снег» і «Пошукі сустрэчы», 1959; «Мост», 1965) аб'яднаны ў пенталогію «Трывожнае шчасце» (1960, 1973, 1982). Выйшлі кнігі апавяданняў і аповесцей: «На знаёмых шляхах» (1949), «Дзве сілы» (1951), «Апавяданні» (1952), «Першае спатканне» (1956), «Матчыны рукі» (1961), «Вячэрні сеанс» (1968), «Лес майго земляка» (1970), «Бацька і дзеці» (1971), «Сцягі над штыкамі» (1976), «Гандлярка і паэт. Шлюбная ноч» (1976, пастаўлены кінафільмы адпаведна ў 1978 і 1980), «Браняпоезд «Таварыш Ленін» (1985), «У роднай сям'і» (1986), «Драма» (аповесці, гістарычныя сцэны, 1990), а таксама кніжка апавяданняў для дзяцей «У Маскву» (1950). У 1965-1966 гг. выйшаў Збор твораў у 5-ці, ў 1977-1979 гг. - у 6 тамах.

Напісаў п'есы «Не верце цішыні» (апублікавана і пастаўлена ў 1958), «Выгнанне блудніцы» (апублікавана і пастаўлена ў 1961, асобнае выданне ў 1962), «Дзеці аднаго дома» (апублікавана і пастаўлена ў 1967), «Экзамен на восень» (1973, пастаўлена ў 1974), «Баталія на лузе» (1975), «І змоўклі птушкі» (1977, пастаўлена ў 1977), Залаты медаль» (1979, пастаўлена ў 1980). Аўтар сцэнарыя 4-серыйнага тэлеспектакля «Трывожнае шчасце» (з А.Гутковічам, пастаўлены ў 1968), кінасцэнарыяў «Крыніцы» (з Ю.Шчарбаковым, пастаўлены ў 1964), «Хлеб пахне порахам» (пастаўлены ў 1974), «Атланты і карыятыды» (пастаўлены ў 1978). У 1974 г. выйшаў зборнік кінааповесцей і п'ес «Экзамен на восень».

Аўтар кніг публіцыстычных і літаратурна-крытычных артыкулаў «Размова з чытачом» (1973), «Карэнні і галіны» (1986).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951) за раман «Глыбокая плынь», Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1959) за раман «Крыніцы», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968) за раман «Сэрца на далоні» і кнігу «Трывожнае шчасце», Літаратурнай прэміі Міністэрства абароны СССР (1978) за кнігу «Гандлярка і паэт. Шлюбная ноч», Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне тэатральнага мастацтва, кінематаграфіі, радыё і тэлебачання (1982) за кінафільм «Вазьму твой боль».

Фальклорная спадчына – гэта няпісаная гісторыя роду чалавечага, тыя асноўныя этапы яго станаўлення, якія паўтарае кожнае новае пакаленне ў сваім зямным існаванні. Гэта актыўны дыялог з прыродай, скіраваны на тое, каб заручыцца яе спагадай і падтрымкай, і адначасова святое яе ўшанаванне.

## Літаратура:


1. Бароўскі, А. М. Бурштынавы подых Прыпяці / Анатоль Бароўскі // Полымя. — 2003. — № 2. — С. 143—160.

2. Бароўскі, А. М. Пякельны рай : аповесці / Анатоль Бароўскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. —326 с.

3. Верамейчык, У. У. Клянуся Прыпяццю : паэзія / Уладзімір Верамейчык. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1988. — 190 с.

4. Волков, А. В. Вчера была война : избранное / А. В. Волков. — Мозырь : КПУП Колор, 2010. — 292 с.

5. Даніловіч, М. А. Лінгвістычнае краязнаўства Гродзеншчыны : дапаможнік па спецкурсах "Лінгвістычнае краязнаўства Гродзеншчыны", "Праблемы беларускай дыялектнай фразеалогіі" ; па курсе "Беларуская дыялекталогія" для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 – Беларуская філалогія / М. А. Даніловіч ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Янкі Купалы. — Гродна : ГрДУ, 2008. — 227 с.

6. Дрозд, В. В. Река Припять / В. В. Дрозд. — Минск : Университетское, 1988. — 77 с. — (Природа рек, озер и водохранилищ Белоруссии).

7. Железняк, І. М. Ойконім Мозир у слов'янському контексті / І. М. Железняк // Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў : зборнік навуковых артыкулаў, 25—мая 2006 г. / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт" ; [адказныя рэдактары: А. В. Солахаў, В. В. Шур ; рэдкал.: В. Я. Барысенка і інш.]. — Мазыр, 2006. — С. 161—162

8. Карабанаў, І. А. Роздум : зборнік паэзіі экалагічна-акмеалагічкага зместу / Карабанаў І. А. — Мазыр : УА МДПУ, 2005. — 109 с.

9. Караткевіч, У. Зямля пад белымі крыламі : нарыс / Уладзімір Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1997.

10. Кніга, У. Д. Веснавая абрадава-святочная культура Мазырска-Прыпяцкага Палесся / У. Д. Кніга // Міжнародныя Шамякінскія чытанні "Пісьменнік – асоба – час" : матэрыялы ІІ Міжнароднай навукова-практычнай канфеэнцыі, Мазыр, 20—21 кастрычніка 2011 г. / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П.Шамякіна" ; рэдкалегія : А. У. Сузько [і інш.]. — Мазыр, 2011. — С. 220—222.

11. Кніга, У. Д. Рэгіянальны і агульнабеларускі аспекты лексікі цяслярства і сталярства Мазырска-Прыпяцкага Палесся / У. Д. Кніга // Слово. Текст. Социум : сборник научных трудов преподавателей филологического факультета / Учреждение образования "Мозырский государственный педагогический университет имени И. П. Шамякина" ; редкол.: Исмайлова Л.В. (отв. ред.) [и др.]. — Мозырь, 2011. — С. 61—68.

12. Ліпскі, У. С Я : Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод : аповесць / Уладзімір Ліпскі ; [пасляслоўе А. Міхальчанка ; мастакі: Я. А. Ларчанка і інш. — Мінск : Беларусь, 1998. — 317 с.

13. Ліпскі, У. С. Мы : аповесць пра нашы прозвішчы / Уладзімір Ліпскі. — Мінск : Беларусь, 2006. — іл.

14. Літаратурнае Палессе ў постацях і лёсах : матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, 17—18 лістапада 2004 г., г. Мазыр / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт" ; [рэдкал.: Кошман П. Р. (адказны рэдактар), Сузько А. У. (адказны рэдактар) і інш.]. —Мазыр, 2005. — 144 с.

15. Лякин, В. А. Фамилии калинового края : [история фамилий жителей Калинковичи в прошлом и настоящем] / В. А. Лякин. — Мозырь : Колор, 2008.

16. Мазыр. 850 год : ут. / пад агульнай рэдакцыяй І. Ф. Штэйнера. — Гомель : Сож, 2005. — Т. 2 : Мазыр літаратурны / [І. Ф Штэйнер, І. А. Бароўская, А. В. Ваньковіч, П. Р. Кошман, Д. Л. Мамачкін, А. М. Мельнікава, С. І. Ханеня] ; Мазырскі гарадскі выканаўчы камітэт, Установа адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны". — 214 с.

17. Мазырскі раён // Памяць Беларусі : рэспубліканская кніга / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.] ; мастак У. П. Свентахоўскі. — Мінск : БелЭн, 2005. — С. 298—301.

18. Палескія перазвоны : зборнік вершаў да 50-годдзя [Мазырскага педагагічнага] інстытута / Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут. — Мазыр, 1994. — 47 с.

19. Песні роднага краю : зборнік твораў мазырскіх самадзейных кампазітараў. — Мазыр, 1992. — 58 с.

20. Полесский этнолингвистический сборник : материалы исследования / Академия наук СССР, Институт славяноведения и балканистики ; [редкол.: Н. И. Толстой (ответственный редактор), А. В. Гура, О. А. Терновская, С. М. Толстая]. — Москва : Наука, 1983. — 315 с.

21. Прыпяцкая рапсодыя : [нарысы, вершы] / Бібліятэка гомельскага абласнога аддзялення ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"; [рэдкалегія: У. М. Гаўрыловіч і інш.]. — Гомель : Сож, 2010. — 340 с. — Змест: аўтары: К. Тураўскі, У. Сыракомля, У. Агіевіч, Н. Перкін, М. Клімовіч, А. Клімовіч, Г. Дашкевіч, В. Лаўгач, Н. Аксёнчык, П. Шруб і інш.

22. Рогалеў, А. Ф. Ля вытокаў назвы Мазыр / А. Ф. Рогалёў // Сцежкі ў даўніну : Геаграфічныя назвы Беларускага Палесся / А. Ф. Рогалеў. — Мінск : Полымя, 1992. — С. 32—36.

23. Сержпутовский, А. К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков / А. К. Сержпутовский. — Санкт-Петербург, 1911. — 214 с.

24. Сержпутоўскі, А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. — Мінск, 1930.23. Славутыя імёны бацькаўшчыны : зборнік / укладальнікі У. Гілепа і інш. — Вып. 2. — Мінск : БФК, 2003.

25. Слова аб роднай прыродзе : пісьменнікі і паэты Беларусі аб прыродзе / складальнік С. М. Грабчыкаў ; [мастак Р. С. Фралоў]. — Мінск : Народная асвета, 1989.

26. Сычова, І. С. Разумовае выхаванне ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся / І. С. Сычова // Пути повышения качества профессиональной подготовки педагога: материалы Международной научно-практической конференции, г. Мозырь, 29—30 марта 2012 г. / Учреждение образования “Мозырский государственный педагогический университет имени И. П. Шамякина”; [редколлегия: В. С. Болбас [и др.]. – Мозырь : УО МГПУ им. И. П. Шамякина, 2012. — С. 100—102.

27. Федарэнка, А. М. Афганская шкатулка : аповесць, апавяданні : [для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту] / Андрэй Федарэнка ; [мастак Дударэнка В. В.]. — Мінск : Юнацтва, 2002. — 219 с. : іл.

28. Федарэнка, А. М. Нічые : аповесці, раман / Андрэй Федарэнка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. — 428 с.

29. Шапялевіч, В. Каля паэзіі: зборнік вершаў / Васіль Шапялевіч. — Мазыр: УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, 2007. — 191 с.

30. Шур, В. В. Беларускія ўласныя імёны : Беларуская антрапаніміка і тапаніміка : дапаможнік для настаўнікаў / Васіль Шур. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. — 237, [2] с. — Бібліяграфія: с. 231—232, 46 назв.

31. Шур, В. В. Уласныя імёны ў часе і прасторы / В. В. Шур. — Мінск : [НІА], 2008. — 100 с.